**Сяргей НОВІКАЎ**

# Абарона Магілёва 1941 года: новыя звесткі

*Нягледзячы на тое, што з пачатку Вялікай Айчыннай вайны мінула ўжо 70 гадоў, па-ранейшаму ёсць дакументы, прысвечаныя розным яе падзеям, у тым ліку і абарончым баям на тэрыторыі Беларусі, якія яшчэ не ўведзены ў навуковы зварот. Іх пераклад і публікацыя дазволяць пашырыць, дапоўніць, удакладніць, а часам нават перагледзець нашы веды па некаторых пытаннях гісторыі вайны.*

Пытанне аб гераічнай абароне Магілёва летам 1941 года можна было б аднесці да ліку даўно вывучаных тэм гісторыі пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі, калі б не выяўленне новых дакументаў і ўзнікненне новых пытанняў па асобных эпізодах яе гісторыі. У 2011 г. на міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць", прысвечанай 70-годдзю абароны Магілёва, старшыня Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта С.Барадаўка выказаў хвалюючы тэзіс аб тым, што *"агульная карціна тых баталій дагэтуль не адноўлена, нягледзячы на наяўнасць шматлікіх сведчанняў і дакументаў, новых знаходак навукоўцаў"*. Такім чынам, застаецца актуальнай задача знайсці максімальна аб'ектыўныя адказы на пакуль існуючыя пытанні ў гісторыі абароны Магілёва летам 1941 года. Пры гэтым неабходна звярнуцца ў тым ліку да нямецкіх дакументаў, уведзеных у навуковы зварот, паколькі аснову савецкай гістарыяграфічнай канцэпцыі складалі ў большасці ўспаміны ўдзельнікаў абароны дняпроўскага рубяжа. Таму без супастаўлення інфармацыі, раней уведзенай у шырокі зварот праз гэты жанр літаратуры, з арыгінальнымі дакументальнымі матэрыяламі на сёння немагчыма напісаць поўную карціну 23-дзённай абароны Магілёва (3—26 ліпеня 1941 г.)[1].

Магілёўскі гісторык М.Барысенка, аўтар новай кнігі "1941-й: пылающие рубежи Днепра и Сожа" адзначае, што, нягледзячы на шматгадовую распрацоўку тэмы, навукова абгрунтаванай канцэпцыі абароны ўсходніх абласцей Беларусі пакуль не існуе[2]. Фактычна даследчыкі толькі прыступілі да яе стварэння. Таму пры той увазе, якая надаецца вывучэнню гэтай тэмы, пра што сведчыць наяўнасць у беларускай гістарычнай навуцы асобнага даследчыцкага напрамку[3], хацелася б звярнуць увагу чытача на новыя звесткі па раней малавядомых аспектах абароны Магілёва.

Да ліку такіх звестак, як ні дзіўна, можна аднесці нават сам факт размяшчэння асобных вайсковых частей Чырвонай Арміі на лініі абароны магілёўскага плацдарма[4]. Так, існавалі пытанні з размяшчэннем 394-га стралковага палка ў абарончай лініі Магілёва па той прычыне, што ён уваходзіў у 110-ю стралковую дывізію, якая абараняла паўночны рубеж Магілёўскага плацдарма. Пры гэтым ветэраны дыскутавалі аб яго сапраўдным месцазнаходжанні. Удакладненні яго размяшчэння вынікаюць з загада № 1 на абарону, аддадзенага камандзірам 172-й страл-



***НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.***
*Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" (Вып. 1—10, Мн., 2002—2012).*

ковай дывізіі М.Раманавым 7 ліпеня 1941 г., які да гэтага часу не быў вядомы не толькі шырокай грамадскасці, але нават прафесійным гісторыкам[5]. Ні арыгінал, ні копіі гэтага дакумента на рускай мове на цяперашні час не выяўлены ў беларускіх і расійскіх архівах. Можна выказаць меркаванне, што ён быў сярод дакументаў, якія трапілі да гітлераўцаў у час захопу горада. У нямецкім архіве выяўлены яго нямецкамоўны пераклад. Знаёмства з загадам дазволіць зрабіць удакладненні адносна размяшчэння, задач і складу некаторых баявых часцей дывізіі.

Цікавасць выклікае і аэрафотаздымак, зроблены разведвальнай службай люфтвафэ 8 ліпеня 1941 года з вышыні 6 тыс. м над Магілёвам *(гл. с. 3 вокладкі)*, які да гэтага часу таксама быў невядомы нават прафесійным даследчыкам абароны горада летам 1941 года. Яго ўвядзенне ў навуковы зварот дае магчымасць лакалізаваць на месцы асобныя аб'екты абароны, якія не раз згадваліся ў мемуарнай літаратуры, але пошук якіх быў практычна немагчымы без канкрэтнай геаграфічнай прывязкі. Пасля публікацыі аэрафотаздымка можна будзе выявіць дакладнае іх месцазнаходжанне, тады як загад № 1 дасць магчымасць убачыць і геаграфію дзеянняў 172-й стралковай дывізіі, якая адыграла вызначальную ролю ў абароне Магілёва летам 1941 года*.

Зазначым, што ў аснове традыцыйнай канцэпцыі абароны Магілёва ляжыць ідэя аб трох этапах абарончых баёў летам 1941 г. Першы этап доўжыўся з 3 па 9 ліпеня, калі адыходзячыя часці 13-й арміі, а таксама 61-га стралковага корпуса, які заняў абарону на дняпроўскім рубяжы, вялі на дальніх і бліжніх подступах да горада напружаныя баі з перадавымі часцямі вермахта. Асноўнымі злучэннямі, якім была пастаўлена задача абараняць дняпроўскі рубеж, з'яўляліся разведвальныя групы, з якіх складаліся асобныя ўзмоцненыя батальёны. Гэтыя атрады на выгадных рубяжах у 20—25 км наперадзе асноўнай лініі абароны сустракалі праціўніка, рашучымі ўдарамі прымушалі яго разгортвацца ў баявы парадак, тым самым замаруджвалі прасоўванне гітлераўцаў на ўсход і выігравалі час, неабходны для стварэння абарончага рубяжа па Дняпры, а таксама канцэнтрацыі войск, якія падцягваліся з глыбокага тылу.

На другім этапе — з 9 па 16 ліпеня — упартыя абарончыя баі ішлі ўжо ў перадполлі, на асноўнай паласе абароны перад Магілёвам і на ўсходнім беразе Дняпра на абодвух флангах пазіцый 61-га стралковага корпуса. Важнейшым вынікам баёў гэтага этапа, як вынікае з мемуарнай літаратуры, было "вымотванне і перамолванне" жывой сілы ворага і яго тэхнікі.

Трэці этап доўжыўся з 16 па 27 ліпеня, калі абаронцы Магілёва апынуліся ў поўным акружэнні. Злучэнні 61-га корпуса былі акружаны ворагам і раздзелены на часткі. 172-я стралковая дывізія і адзін полк 110-й стралковай дывізіі апынуліся адрэзанымі ад асноўных сіл корпуса. На гэтым этапе, як адзначаў камандуючы Заходнім фронтам генерал-лейтэнант А.Яроменка, з асаблівай сілай праявіліся адвага і гераізм абаронцаў дняпроўскага рубяжа, якія змагаліся з ворагам, пераўзыходзячым іх у сілах па меншай меры ў 5 разоў. Да гэтага этапа адносяцца і спробы вырвацца з кальца акружэння[6]. Такога падыходу таксама прытрымліваецца ў сваёй найноўшай працы вядомы даследчык абарончых баёў на магілёўскім напрамку летам 1941 г. А.Косцераў[7].

Сучасная беларуская гістарычная навука імкнецца напісаць аб'ектыўную гісторыю абароны Магілёва. Не спыняюць сваіх даследчыцкіх пошукаў магілёўскія гісторыкі М.Барысенка і А.Косцераў[8]. З'яўленне новых пунктаў гледжання на баявыя падзеі трагічнага лета 1941 г. у Беларусі неабходна разглядаць як важны паказчык навуковай і грамадскай вастрыні праблемы.

Сёння ніхто не аспрэчвае той факт, што вайна Германіі супраць СССР вызначалася асаблівымі злачынствамі вермахта ў дачыненні да савецкіх ваеннапалонных. Не абмінула гэта трагедыя і беларускую зямлю, дзе загінулі сотні тысяч савецкіх воінаў, у тым ліку дзясяткі тысяч радавых, сяржантаў і афіцэраў, якія трапілі ў нямецкі палон пад Магілёвам. Нельга замоўчваць таксама і тое, што асобы цяжар нямецкага палону давялося вынесці камандзіру 172-й стралковай дывізіі генерал-маёру М.Раманаву, які загінуў у лагеры XIII-C пад Хамельбургам у Германіі ў пачатку снежня 1941 г. Выявіць такія гістарычныя факты магчыма на аснове больш шырокага выкарыстання нямецкіх дакументаў.

Звернемся да іх разгляду. У адпаведнасці з планам па абароне Магілёва, непасрэдная абарона горада ўскладалася на 172-ю стралковую дывізію пад камандаваннем генерал-маёра М.Раманава з прыдадзенымі ёй часцямі і асобнымі падраздзяленнямі. На заходнім беразе Дняпра, перакрыўшы шашы Магілёў — Бабруйск і Магілёў — Мінск, у раёне вёсак Цішоўка — Буйнічы абарону ажыццяўляў 388-ы стралковы полк пад камандаваннем палкоўніка С.Куцепава з 340-м лёгкім артылерыйскім палком; у раёне вёсак Буйнічы — Зацішша — 514-ы стралковы полк пад камандаваннем падпалкоўніка С.Боніча, які падтрымліваў 493-і гаўбічны артылерыйскі полк. На ўсходнім беразе Дняпра, прыкрываючы левы фланг і тыл дывізіі, — 747-ы стралковы полк на чале з падпалкоўнікам А.Шчагловым і пры падтрымцы 601-га гаўбічнага корпуснага артылерыйскага палка. Аэрадром і мост цераз Днепр прыкрываў 341-ы асобны зенітны дывізіён[9].

З аналізу айчынных дакументальных і гістарыяграфічных крыніц вынікае, што гісторыкам пакуль добра вядомы толькі апошні загад камандзіра 172-й стралковай дывізіі генерал-маёра М.Раманава, аддадзены ім у ноч з 25 на 26 ліпеня 1941 г. Паводле яго, ставілася задача ўсім часцям і штабам з наступленнем цемнаты пакінуць Магілёў і пачаць прабівацца з акружэння[10]. У той жа час у айчынных гістарычных працах нічога не згадваецца пра першы загад, аддадзены камдзівам на абарону горада толькі 7 ліпеня. Вядома, што, паводле баявога загаду войскам

* Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць магілёўскаму гісторыку М.Барысенку за прафесійную ацэнку новых дакументальных знаходак.

61-га стралковага корпуса ад 5 ліпеня 1941 г., 172-й стралковай дывізіі з асобным супрацьтанкавым дывізіёнам ставілася задача заняць рубеж абароны па лініі вёсак Пашкава — Цішоўка — Буйнічы[11]. У гістарычнай літаратуры згадваецца, што камандзір 172-й стралковай дывізіі пасля гэтага *"ўдакладніў задачы па арганізацыі ўзаемадзеяння паміж часцямі, сістэмы агню і забеспячэння ўсімі відамі баявога забеспячэння"*. У чым заключалася сутнасць тых удакладненняў, пра якія піша генерал-лейтэнант А.Яроменка[12], немагчыма даведацца нават з успамінаў камандзіра 61-га стралковага корпуса генерал-маёра Ф.Бакуніна. Вядома толькі тое, што яны адпавядалі ўказанням камандзіра 61-га стралковага корпуса.

У выніку заставалася загадкай, што насамрэч было зроблена камандзірам 172-й дывізіі М.Раманавым і яго непасрэднымі падначаленымі для стварэння высокаэфектыўнай сістэмы баявога забеспячэння і арганізацыі абароны Магілёва — горада, які немцы ў канцы ліпеня характарызавалі адным словам — "крэпасць". Адказ на гэтае і іншыя важныя пытанні арганізацыі абароны Магілёва ў пачатку ліпеня мы можам знайсці ў дакументах, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы зварот.

Размова ідзе аб дзвюх дакументальных крыніцах. Першая з іх — "Баявы загад № 1", аддадзены камандзірам 172-й стралковай дывізіі на абарону ў 20.30 гадзін 7 ліпеня 1941 г. Другі — аэрафотаздымак, зроблены немцамі літаральна на другі дзень, 8 ліпеня, у 16 гадзін 12 хвілін з вышыні 6000 м *(гл. с. 3 вокладкі)*. Ён дазваляе высветліць размяшчэнне некаторых часцей. Прынамсі, гэта вызначэнне вайсковай часці, пазначанай на фотаздымку лічбай 5. Пакуль застаецца без адказу пытанне аб нумары той вайсковай часці. Пад лічбай 6 абазначаны ангары. Паводле ўспамінаў, у той мясцовасці сапраўды былі склады, але цяпер стала магчымым вызначыць іх канкрэтнае месцазнаходжанне. Гэта ж можна сказаць і ўдачыненні да іншых палявых умацаванняў, да 8 ліпеня ўзведзеных на магілёўскім плацдарме абароны, і г.д.

Нагадаем, што да выхаду загаду № 1 камандзіра 172-й стралковай дывізіі М.Раманава ўсе паўнамоцтвы па аддачы распараджэнняў падраздзяленням гэтай дывізіі належалі камандзіру 110-й дывізіі палкоўніку У.Хлебцаву. Па ўказанню камандзіра 61-га стралковага корпуса Ф.Бакуніна, дыслакацыя трох баявых участкаў вакол Магілёва была афармлена загадам камдзіва 110-й дывізіі 3 ліпеня 1941 г.[13].

Такім чынам, зварот да нямецкіх крыніц у працэсе даследавання гісторыі абароны Магілёва на цяперашні час неабходны. Дзякуючы погляду праз фотакамеру разведвальнай службы 2-га паветранага корпуса люфтваффэ ў пачатку ліпеня 1941 года, праз 70 гадоў можна дакладна вызначыць месцы знаходжання асобных баявых аб'ектаў, пра якія доўгі час вялася размова, але не было доказаў іх канкрэтнага размяшчэння ў першыя дні абароны горада на тэрыторыі магілёўскага ўмацаванага плацдарма. Магчыма, гэтыя звесткі дазволяць пошукаваму атраду выявіць раней невядомыя месцы пахавання абаронцаў горада і аднавіць гісторыю іх подзвігу.

Тэкст загада № 1 падрыхтаваны да друку на аснове дакументаў, выяўленых аўтарам у фондзе Федэральнага ваеннага архіва Германіі ў Фрайбургу. Упершыню вызначаецца канкрэтная дата пачатку абароны Магілёва падраздзяленнямі 172-й стралковай дывізіі, якая з'яўлялася асноўнай на Магілёўскім абарончым плацдарме. У навуковы зварот уводзяцца дакладныя звесткі аб вайсковых часцях, якія забяспечвалі баявую абарону горада ў ходзе першага этапа баёў войскаў Заходняга фронту на магілёўскім напрамку. Прыводзяцца малавядомыя факты аб размяшчэнні савецкіх часцей і асобных абарончых умацаванняў — пачынаючы ад артылерыйскіх, знішчальных процітанкавых дывізіёнаў, сапёрных батальёнаў і да кожнага з чатырох стралковых палкоў 110-й і 172-й стралковых дывізій. Аэрафотаздымак, выяўлены сярод дакументаў дзённіка баявых дзеянняў 2-й палявой арміі вермахта, фіксуе факты падрыхтоўкі абарончых умацаванняў Магілёва. Прыведзены вынікі яго дэшыфроўкі, зробленай разведвальнай службай люфтваффэ, паводле якой выяўлены ўзведзеныя процітанкавыя і падрыхтаваныя зенітныя пазіцыі, месцы размяшчэння вайсковых часцей. Пераклад дакументаў зроблены поўнасцю.

[1] Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зб. навук. прац Міжнароднай навуковай канферэнцыі 29—30 чэрвеня 2011 г., г. Магілёў / уклад.: А.М.Бацюкоў, І.А.Пушкін. Магілёў, 2011. С. 3.

[2] Борисенко Н.С. Особенности обороны днепровского и сожского рубежей в июле 1941 года на Могилёвщине // Там жа. С. 172; Ён жа. 1941-й: пылающие рубежи Днепра и Сожа. Могилёв, 2011. С. 9; Ён жа. Днепровский рубеж: трагическое лето 1941-го. Могилёв, 2005. С. 6.

[3] Новікаў С.Я. Абарона Магілёва (20—26 ліпеня 1941 г.) у святле новых дакументальных нямецкіх крыніц // Беларускі гістарычны часопіс. 2008, № 7. С. 44.

[4] Борисенко Н.С. 1941-й: пылающие рубежи Днепра и Сожа. С. 197.

[5] Костеров А.П. Оборонительные бои на могилёвском направлении летом 1941 года. Мн., 2010. С. 79.

[6] Ерёменко А.И. Героический Могилёв // Солдатами были все. 2-е, дополненное и исправленное издание. Мн., 1972. С. 55—62.

[7] Костеров А.П. Оборонительные бои на могилёвском направлении летом 1941 года. С. 77.

[8] Борисенко Н.С. Днепровский рубеж: трагическое лето 1941-го. Могилёв, 2005; Ён жа. 1941-й: пылающие рубежи Днепра и Сожа. Могилёв, 2011; Костеров А.П. Оборонительные бои на могилёвском направлении летом 1941 года. Мн., 2010; Новікаў С. Адлюстраванне падзей на Буйніцкім полі 13 ліпеня 1941 г. у нямецкіх дакументах // Беларускі гістарычны часопіс. 2007, № 7. С. 12—19; Ён жа. Абарона Магілёва (20—26 ліпеня 1941 г.) у святле новых дакументальных нямецкіх крыніц // Беларускі гістарычны часопіс. 2008, № 7. С. 44—53; Ён жа. Магілёўская бітва 1941 года ў данясеннях вермахта // Беларускі гістарычны часопіс. 2010, № 7. С. 23—34.

[9] Гардзееў Б.П. Магілёва абарона 1941 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: энцыклапедыя; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мн., 1990. С. 315—316.

[10] Борисенко Н.С. 1941-й: пылающие рубежи Днепра и Сожа. С. 304.

[11] Бакунин Ф.А. На днепровском рубеже // Солдатами были все. С. 63—79.

[12] Ерёменко А.И. Героический Могилёв // Там жа. С. 58.

[13] Борисенко Н.С. 1941-й: пылающие рубежи Днепра и Сожа. С. 196.



102

– Übersetzung –

Einsatzbefehl Nr. 001, 172 Div., Wald 1 km. ostw. Satischje 20,30
7.7.41 Karte 50000, 500000, 1000000.

103

1. In Richtung auf Bobruisk – Mogilew, Bobruisk – Rogatschew gehen Teile der 4. und 3. Pz.Div. der Faschisten vor. Im Raum von Korschtnisa führte der Gegner etwa 1 Inf. Btl., unterstützt von 60 mittleren Pz. und Fliegern, in den Kampf. Vor der Front der Division wurde Tätigkeit kleiner Pz.Gruppen festgestellt.

2. Rechts verteidigt sich die 110. Sch.Div. Trennungslinie: Tschausy, Suchary, Makarinsy, Knjashisy, /ausschl./ D.Neshkow.

Links verteidigt die 187.Sch.Div. Ostufer des Dnjepr.

10. Bis zur Errichtung von Versorgungsstellen hat die Versorgung mit Munition, Brennstoff und Verpflegung gemäß den bereits gegebenen Anordnungen zu erfolgen.

11. Div.Gef.St. ab 20.oo Uhr 6.7. Wald 1 km. ostw. Satischje, vorgeschobener Gef.St. – Ziegelei bei 175,6 ab 20 Uhr 6.7. Reserve-Gef.St. – Höhe 179,2.
Meldungen alle 5 – 6 Stunden, bei Angriff des Gegeners alle 2 – 3 Stunden.

Kommandeur /Romanoff/
Gen.Major

Stellv. /Katoschin/
Major

F.d.R. F.d.R.d.Übersetzung
Ia. gez. Major Weseloff Tauk
Hauptmann i.G.

*Фрагменты загада № 1.*

Федэральны ваенны архіў Германіі, далей BA-MA. RH 24-7/48: Einsatzbefehl Nr. 001 v. 07.07.41, Bl 102-103; BA-MA. RH 21-2/648: Auswertung der Aufnahme v. 8.07.41, Bildnummer 035. Арыгіналы (пераклад аўтара). Друкуюцца ўпершыню.

**Пераклад**

**Баявы загад № 1, 172-я стралковая дывізія, лес 1 км на ўсход ад в. Зацішша, 20 гадзін 30 хвілін, 7.07.1941**

*Карты 50000, 500000, 1000000*

1. У напрамку на Бабруйск — Магілёў, Бабруйск — Рагачоў наступаюць часці 4-й і 3-й танкавых фашысцкіх дывізій. У раёне Коршніцы праціўнік увёў у бой каля аднаго пяхотнага батальёна пры падтрымцы амаль 60 сярэдніх танкаў і самалётаў. Перад фронтам дывізіі выяўлена дзейнасць невялікіх танкавых груп.

2. Справа абараняецца 110-я стралковая дывізія. Раздзяляльная лінія: Чавусы, Сухары, Макарынцы, Княжыцы (выключаючы Нова-Пашкава).

Злева абараняецца 187-я стралковая дывізія. Усходні бераг Дняпра. Раздзяляльная лінія: Петухоўка, Капані, Кадзінка, Дашкаўка, Алень.

3. 172-я стралковая дывізія з 394-м стралковым палком, 601-м гаўбічным палком (за выключэннем аднаго дывізіёна), сродкі процітанкавай абароны 110-й стралковай дывізіі абараняюць плацдарм горада Магілёва. Баявая лінія фронту — Пашкава, Цішоўка, Буйнічы, Дашкаўка. Яна знішчае праціўніка пры наступленні на Магілёў у іх палосах наступлення.

Перадавыя дазоры: Палыкавічы, Засценак, Нова-Пашкава, Савасцьянавічы, Дабрасневічы, паўднёва-

заходні край Кліна, вышыня 182,9, пераход чыгункі на захад ад піянерскага лагера, заходні край Навасёлак.

Гатоўнасць да 24.00 7 ліпеня.

4. 394-ы стралковы полк з 2-м дывізіёнам 340-га артылерыйскага палка, 2-м дывізіёнам 493-га гаўбічнага артылерыйскага палка, 209-м асобным знішчальным процітанкавым артылерыйскім дывізіёнам, батарэямі 165-й стралковай дывізіі і 388-га стралковага палка абараняюць участак саўгаса (агародніны) (выключаючы Зацішша).

Вораг павінен знішчацца пры наступленні на Магілёў з поўначы з напрамку Шклова, з паўднёвага захаду і захаду ад Княжыц.

Стык паблізу да 388-га стралковага палка павінен ахоўвацца. Пазіцыі на ўсходнім беразе Дняпра неабходна падрыхтаваць у раёне Мастка, вышыні 149,9.

Левая мяжа: Цямровічы, Курэні, Нікалаеўка, паўднёвы край Магілёва, Карабанаўка, Куці, рака Друць.

5. 388-ы стралковы полк з 1-м дывізіёнам 430-га артылерыйскага палка, 1-м дывізіёнам 493-га гаўбічнага артылерыйскага палка, 3-м дывізіёнам 632-га артылерыйскага палка, 200-м і 174-м асобнымі знішчальнымі процітанкавымі артылерыйскімі дывізіёнамі абараняюць плацдарм у раёне: Зацішша, Буйнічы. Праціўнік павінен быць знішчаны пры наступленні на Магілёў. Стык да 747-га стралковага палка ахоўваць па Дняпры каля Буйніч.

Правая мяжа: Благавічы, Бароўка, Днепр, Буйнічы, Заточы, рака Друць.

6. 747-ы стралковы полк з 601-м гаўбічным артылерыйскім палком (без першага дывізіёна) абараняе ўчастак Брады, Палетнікі, Малая Бароўка, вышыня 166,3 па лініі фронту — Брады, Баракі, паўночны край Грэбенева, вышыня 169,8, Палетнікі, Малая Бароўка з фронтам на поўдзень. Знішчае праціўніка, які будзе рухацца на Магілёў з поўдня і паўднёвага ўсходу, а таксама ў выпадку фарсіравання Дняпра перад Магілёвам. На ўсходнім беразе Дняпра рыхтуюцца пазіцыі фронтам на поўнач і паўночны захад.

Адказвае за забеспячэнне фланга да 514-га стралковага палка.

Мяжа злева: чыгуначны раз'езд Атраш'е, станцыя Рэста, Шчажэры, Буйнічы.

7. 514-ы стралковы полк з 3-м дывізіёнам 493-га гаўбічнага артылерыйскага палка абараняе ўсходні бераг Дняпра на ўчастку (выключаючы) Брады, Бароўка. Знішчае праціўніка пры набліжэнні да пераправаў цераз Днепр. Забеспячэнне фланга да 292-га стралковага палка ў раёне парома каля конезавода.

8. <u>Артылерыя.</u>

а) На ўчастку 394-га стралковага палка — 2-і дывізіён 340-га артылерыйскага палка, 2-і дывізіён 493-га гаўбічнага артылерыйскага палка. Камандзір групы — камандзір 2-га дывізіёна 340-га артылерыйскага палка.

<u>Задача:</u> падрыхтоўка процітанкавай абароны, затрымка набліжэння праціўніка з напрамку са Шклова і Мінска, знішчэнне танкаў на шашы з напрамку Орша, Засценак і Нова-Пашкава і Мінск. Перашкодзіць набліжэнню пяхоты з раёна Гаі, Голы Лес на паўночны захад ад Гаеў, Голы Лес на ўсход ад Нова-Пашкава, Нова-Пашкава, Голы Лес на захад Пашкава. Падрыхтоўка загараджальнага агню на пераправе Лахвы каля вышыні 164,5.

б) На ўчастку 388-га стралковага палка — 1-ы дывізіён 340-га артылерыйскага палка, 1-ы дывізіён 493-га гаўбічнага артылерыйскага палка, 3-і дывізіён 632-га артылерыйскага палка. Камандзір групы — камандзір 340-га артылерыйскага палка.

<u>Задача:</u> падрыхтоўка процітанкавай абароны, затрымка набліжэння праціўніка з напрамку Бабруйск і знішчэнне танкаў на дарозе ў напрамку Дабрасневічы, Галынец, Брускі, Цішоўка, Мінск і Салтанаўка. Перашкодзіць набліжэнню пяхоты з раёнаў Голы Лес, Галынец на паўднёвы захад ад Барсукоў, вышыня 182,9, Галынец на поўдзень ад Буйніч. Падрыхтоўка загараджальнага агню на пераправе каля Дабрасневіч і на бабруйскай шашы.

в) На ўчастку 514-га стралковага палка — 3-і дывізіён 493-га гаўбічнага артылерыйскага палка. Камандзір групы — камандзір 3-га дывізіёна 493-га гаўбічнага артылерыйскага палка. Загады аддае камандзір 514-га стралковага палка.

г) На ўчастку 747-га стралковага палка — 601-ы гаўбічны артылерыйскі полк (за выключэннем аднаго дывізіёна).

<u>Задача:</u> падрыхтоўка процітанкавай абароны, затрымка варожага набліжэння з поўдня і паўднёвага захаду. Знішчэнне наступаючых танкаў з поўдня і паўднёвага захаду. Перашкодзіць набліжэнню пяхоты з напрамкаў саўгас Вейна, Голы Лес на поўдзень і паўднёвы захад ад рамонтнага ўчастка і не даць замацавацца на вышыні 167,8.

Гатоўнасць усіх артылерыйскіх палкоў 24.00 7 ліпеня.

9. Для інжынерных часцей: умацаванне перашкод у перадполлі з напрамкаў на Шклоў, Мінск, Цяхцінскае, Бабруйск, Быхаў, Рагачоў. План затрымкі на асноўным фронце давесці да ўсіх часцей.

10. Да стварэння пунктаў забеспячэння забеспячэнне боезапасамі, палівам і харчаваннем праводзіцца адпаведна папярэднім распараджэнням.

11. Месца знаходжання каманднага пункта дывізіі з 20.00 6 ліпеня 1941 г. — лес 1 км на ўсход ад Зацішша. Перадавы камандны назіральны пункт — цагельня каля вышыні 175,6 з 20.00 6 ліпеня. Запасны камандны пункт — вышыня 179,2.

Сувязь: кожныя 5—6 гадзін, пры наступленні праціўніка кожныя 2—3 гадзіны.

Камандзір генерал-маёр Раманаў

Намеснік камандзіра маёр Кацюшын

Сапраўдна: маёр (подпіс) Весялоў

Правільнасць перакладу: гаўптман (подпіс)